ЭКАДОМ

ecohome.ngo

# ГАДАВАЯ СПРАВАЗДАЧА | 2023

# ЗМЕСТ

3 УВОДЗІНЫ

5 ХТО МЫ І ШТО МЫ РОБІМ

6 НАША 27-ГАДОВАЯ ГІСТОРЫЯ

9 МАНІТОРЫНГ І АНАЛІЗ СТАНОВІШЧА ЭКААКТЫВІСТА_К І ЭКАНДА Ў БЕЛАРУСІ

11 ВЫРАШЭННЕ ЭКАЛАГІЧНЫХ ПРАБЛЕМ У БЕЛАРУСІ

14 UWEC: ЭКАЛАГІЧНЫЯ НАСТУПСТВЫ ВАЙНЫ ВА УКРАІНЕ

16 УСТОЙЛІВАЯ ЭНЕРГЕТЫКА І АНТЫЯДЗЕРНАЯ КАМПАНІЯ

18 ЗЯЛЁНАЯ БЕЛАРУСЬ: РАСПРАЦОЎКА «ЗЯЛЁНАГА» БАЧАННЯ БУДУЧЫНІ БЕЛАРУСІ

19 ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ ТЭМЫ АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ

22 ПЛАНЫ НА БУДУЧЫНЮ

# ✱УВОДЗІНЫ

***Вітаю, шаноўныя сябры і сяброўкі!***

Хочацца ў вітальным слове казаць пра экаперамогі і дасягненні, але 2023 год вырашыў загартоўваць нас далей і падкінуў выпрабаванняў, складанасцей і сусветнага хаосу.

У такіх абставінах вельмі лёгка страціць сябе, заблытацца, пахіснуцца верай у мэтазгоднасць таго, што робіш, але мы вытрымалі. Галоўнае дасягненне Экадома застаецца ранейшым: мы захавалі крутую каманду, працягнулі дзейнасць на карысць Беларусі, не здрадзілі сваім прынцыпам і сталі мацнейшымі.

Я шчыра дзякую ўсёй камандзе Экадома. Гэта тыя людзі, якія штодзённа натхняюць і надаюць веры ў найлепшую (зялёную :)) будучыню Беларусі. На жаль, не ўсе мае калегі і каляжанкі публічныя людзі, каб можна было пералічыць тут па імёнах, але ўсіх аб'ядноўвае прафесіяналізм, апантанасць, крэатыўнасць і шчырае жаданне рабіць усё магчымае, каб хутчэй вярнуцца ў Беларусь.

Дзякуй людзям, партнёрам, арганізацыям, якія падтрымлівалі нас фінансава, інфармацыйна, экспертна цягам года. Без вас усе справы і дасягненні ў гэтай справаздачы не былі б магчымымі ў такім маштабе.

Дзякуй усім беларусам і беларускам, якія, як птушкі, раскіданы цяпер па свеце, але працягваюць цікавіцца экалагічнымі праблемамі і дбаць пра стан роднай краіны, дапамагаюць распаўсюджваць важную інфармацыю, – мы цэнім кожную падабайку, каментарый, рэпост у нашых сацыяльных сетках.

Так сталася, што Экадом застаўся ледзьве не адзіным голасам беларускай незалежнай экалагічнай супольнасці, які гатовы публічна казаць праўду пра тое, што адбываецца ў краіне, пра экапарушэнні, рэпрэсіі экаактывіста_к.

Калі вам, як і нам, баліць за экалагічныя праблемы Беларусі, калі вы падзяляеце нашы каштоўнасці і знаходзіцеся цяпер у бяспецы (не ўнутры краіны), калі ў вас ёсць магчымасць і гатоўнасць дапамагчы – **падтрымайце нас** фінансава ці далучайцеся ў якасці валанцёр_кі (**пішыце сюды**).

Разам мы можам больш!

А пакуль дзелімся з вамі асноўнымі падзеямі за мінулы год і шчыра дзякуем, што застаяцеся з намі. Жыве Экадом, жыве Зялёная Беларусь!

*З павагай да кожнай і кожнага,*
***Карына Салавей*,**
*менеджарка Экадома*



# ХТО МЫ І ШТО МЫ РОБІМ

## *Хто мы*

**Экадом быў заснаваны ў 1996 годзе для прасоўвання экалагічна прыязнага ладу жыцця і ідэй устойлівага развіцця. Стварэнне Экадома ініцыявала група энтузіяста_к, актывіста_к і летуценні_ц, якія падзялялі прыхільнасць экалагічным прынцыпам і хацелі падзяліцца сваімі ідэямі з іншымі. Мы адна з найстарэйшых некамерцыйных экалагічных арганізацый у Беларусі. Да жніўня 2021 года Экадом з'яўляўся юрыдычнай асобай у Беларусі. Але мы не спынілі сваю працу і пасля ліквідацыі.**

## *Наша місія*

Экадом, грунтуючыся на прынцыпах дэмакратыі і ўстойлівага развіцця, разам з аднадумцамі стварае гарманічныя адносіны ўнутры і вакол сябе, у доме, краіне, свеце, у сусвеце.

## *Што мы робім і навошта*

Экадом шукае баланс паміж прыродай і цывілізацыяй. Мы хочам наблізіцца да разумення свету і свайго месца ў ім. У сваёй працы мы шчыльна супрацоўнічаем з іншымі грамадскімі экалагічнымі (і не толькі) арганізацыямі, міжнароднымі структурамі, ініцыятывамі і актывіст_камі.

## *Кірункі нашай дзейнасці*

- МАНІТОРЫНГ І АНАЛІЗ СТАНОВІШЧА ЭКАЛАГІЧНЫХ АКТЫВІСТА_К І ЭКАНДА Ў БЕЛАРУСІ
- УСТОЙЛІВАЯ ЭНЕРГЕТЫКА І АНТЫЯДЗЕРНАЯ КАМПАНІЯ
- ВЫРАШЭННЕ ЭКАЛАГІЧНЫХ ПРАБЛЕМ У БЕЛАРУСІ
- UWEC: ЭКАЛАГІЧНЫЯ НАСТУПСТВЫ ВАЙНЫ ВА УКРАІНЕ
- «ЗЯЛЁНАЯ БЕЛАРУСЬ»: РАСПРАЦОЎКА «ЗЯЛЁНАГА» БАЧАННЯ БУДУЧЫНІ БЕЛАРУСІ
- ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ ТЭМЫ АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ



# НАША 27-ГАДОВАЯ ГІСТОРЫЯ

**1991** Стварэнне Экадома як экалагічнай ініцыятывы на базе моладзевай рэспубліканскай арганізацыі Next Stop – New Life. У 1996 годзе Экадом зарэгістраваўся як грамадскае аб'яднанне.

**1996** Наша каманда правяла першыя ў Беларусі міжнародныя курсы пермакультуры[1].

**2000** Адбыўся першы форум экаНДА, ініцыятарам якога быў Экадом.

**2001** Пачатак працы над імплементацыяй палажэнняў Орхускай канвенцыі, якую ратыфікавала Беларусь. Орхуская канвенцыя – канвенцыя Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН «Аб доступе да інфармацыі, удзеле грамадскасці ў прыняцці рашэнняў і доступе да правасуддзя па пытаннях, што тычацца навакольнага асяроддзя». Шматгадовая праца Экадома з канвенцыяй дазволіла палепшыць заканадаўства аб удзеле грамадскасці ў прыняцці экалагічна значных рашэнняў у Беларусі і доступу да экалагічнай інфармацыі, а таксама практыку яго прымянення.

---

[1] Пермакультура – гэта спосаб экалагічнага праектавання, які дапамагае вырошчваць прадукты, будаваць дамы і ствараць супольнасці з мінімальным уздзеяннем на навакольнае асяроддзе.

**2006**

Пачатак антыядзернай дзейнасці Экадома ў сувязі з будаўніцтвам АЭС у Астраўцы (Гродзенская вобласць). У 2008 годзе мы ініцыявалі стварэнне Беларускай антыядзернай кампаніі (БАЯК). Актывіст_кі ініцыятывы ладзілі абмеркаванні і круглыя сталы з навукоўцамі, праводзілі першую ў Беларусі грамадскую экаэкспертызу;

ініцыюем стварэнне таварыства экалагічных арганізацый «Зялёная сетка».

**2008**

Сталі актыўнымі ўдзельнікамі аргкамітэта штогадовага шэсця, прымеркаванага да гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС («Чарнобыльскі шлях»).

**2010**

Звярнуліся ў суд горада Астравец з патрабаваннем даць інфармацыю для правядзення грамадскай экспертызы Беларускай АЭС. Гэта справа стала першай у развіцці практыкі **судовай абароны экалагічных правоў грамадзян у Беларусі**;

правялі першую ў Беларусі грамадскую экалагічную экспертызу (праекта будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Рэспубліцы Беларусь).

**2011**

Пачатак кампаніі па абароне парку імя 40-годдзя Кастрычніка ў цэнтры Мінска, у якой актыўны ўдзел прынялі мясцовыя жыхары, Экадом і «Зялёная сетка». Адміністрацыя горада і забудоўшчык планавалі высечы частку парку і пабудаваць гасцініцу да чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе. Адстаяць дрэвы не ўдалося, пабудаваную гасцініцу назвалі «Пекін». Але кейс стаў рэзанансным і павялічыў цікавасць людзей да праблемы забудовы і высякання зялёных зон.

**2014**

Экадом накіраваў паведамленне пра пераслед антыядзерных актывіст_ак у Камітэт па выкананні Орхускай канвенцыі. Менавіта гэта справа паклала пачатак стварэнню механізму хуткага рэагавання ў рамках Орхускай канвенцыі ў выпадках пераследу экаактывіста_к. Адным з эпізодаў было затрыманне Ірыны Сухій, Таццяны Новікавай і Андрэя Ажароўскага. Яны збіраліся перадаць у амбасаду РФ у Мінску адкрыты зварот супраць падпісання генеральнага кантракта на будаўніцтва АЭС;

дапамаглі мясцовым жыхарам дамагчыся пераносу аднаго са свінакомплексаў, які планавалі пабудаваць каля вёскі Мойсічы (за тры кіламетры ад Маладзечна), паказаўшы важнасць удзелу грамадскасці.

**2016**

Пачатак кансультацый мясцовых жыхароў у Мінску ў ваколіцах сквера Катоўка (раён Сельгаспасёлка). Сквер хацелі часткова высечы і пабудаваць у ім каталіцкі храм. Мясцовыя жыхары і актывіст_кі былі супраць і нават суткамі дзяжурылі ў скверы. У выніку будаўніцтва ўсё ж перанеслі. Гэты гучны і складаны выпадак ярка пазначыў, чаму трэба абмяркоўваць праекты забудовы на ранняй стадыі;

запуск інфалініі «Зялёны тэлефон» для вырашэння экалагічных праблем. Ідэя службы складалася ў тым, каб даць людзям парады і інструменты для самастойнага вырашэння экапраблем, а не вырашыць сітуацыю за іх.

**2017**

Стварэнне выставы «Астравец культуры», на якой маста_чкі, архітэктар_кі, эколагі і экалагіні прадставілі свае бачанне далейшага лёсу недабудаванай АЭС у Астраўцы. Маста_чкі, эколагі і экалагіні прысвоілі сабе цела Астравецкай АЭС і стварылі магчымасць іншай будучыні.

**2018**

Наша каманда падрыхтавала сцэнарый энергетычнай [р]эвалюцыі ў Беларусі: пераходу на 100% узнаўляльнай энергіі ў краіне.

**2021**

Экадому, найстарэйшай экалагічнай арганізацыі Беларусі, споўнілася 25 гадоў;

грамадскае аб'яднанне «Экадом» ліквідавана рашэннем Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь. Перад ліквідацыяй прайшлі ператрусы ў Ірыны Сухій, сяброўкі Рады арганізацыі, а таксама ў Марыны Дубінай, дырэктаркі Экадома. Міністэрства інфармацыі абмежавала доступ да старога сайта Экадома: ecohome-ngo.by;

на 7-й Сустрэчы бакоў Орхускай канвенцыі ліквідацыя Экадома кваліфікавана як пераслед і ўціск экаНДА. Беларусі рэкамендавана аднавіць ГА «Экадом».

**2022**

Беларусь афіцыйна выйшла з Орхускай канвенцыі;

Экадом прызналі «экстрэмісцкім фарміраваннем»;

Экадом стаў адным са стваральнікаў міжнароднай ініцыятывы UWEC у адказ на вайну ва Украіне.

**2023**

Экадом стаў удзельнікам і адным са стваральнікаў альянсу «Зялёная Беларусь»;

мы прынялі ўдзел у канферэнцыі ў Венскім універсітэце «Абаронцы навакольнага асяроддзя» і ў падрыхтоўцы Прамежкавага даклада аб выкананні рэкамендацый, атрыманых Рэспублікай Беларусь у рамках трэцяга цыкла Універсальнага перыядычнага агляду.



# МАНІТОРЫНГ І АНАЛІЗ СТАНОВІШЧА ЭКААКТЫВІСТА_К І ЭКАНДА Ў БЕЛАРУСІ

## *ПРА ШТО ГЭТА І НАВОШТА*



**Людзі, якія рэалізуюць свае экалагічныя правы, не павінны падвяргацца ціску і рэпрэсіям з боку дзяржавы праз сваю дзейнасць. Агульная палітычная сітуацыя ў Беларусі непазбежна ўплывае на экалагічную сферу. Для нас важна сачыць за лёсам экалагічнай галіны ў Беларусі, умовамі, у якіх актывіст_кі працягваюць вырашаць экалагічныя праблемы, і пагрозамі і выклікамі, з якімі яны сутыкаюцца. Акрамя таго, мы асвятляем гісторыі палітвязняў і палітвязынак, якія таксама былі экаактывіст_камі, і гаворым пра магчымасці праявіць з імі салідарнасць.**

- На гэты момант нам **вядома**, што ў турме знаходзяцца 10 палітычных вязняў і палітвязынак, якія таксама былі экалагічнымі актывіст_камі.

- Да канца 2023 года 116 экалагічных арганізацый або НДА, якія маюць экалагічны складнік у сваёй дзейнасці, былі ліквідаваны або прынялі рашэнне аб самаліквідацыі.

- Працягваліся выпадкі затрымання і ператрусаў у экалагічных актывіста_к, якія спрабавалі прыцягнуць увагу да экапраблем. У прыватнасці, прайшлі ператрусы ў актывіста_к, якія збіралі подпісы супраць будаўніцтва цэха «Камунаркі» па перапрацоўцы какава-бабоў.

- Мы таксама фіксавалі пераслед журналіста_к за асвятленне экалагічна важных тэм. Напрыклад, 12 чэрвеня стала вядома пра затрыманне 8 супрацоўні_ц мясцовага светлагорскага выдання: верагодна, за працу над сюжэтам пра выбух на Светлагорскім цэлюлозна-кардонным камбінаце 7 чэрвеня, у якім загінулі тры чалавекі.

21 траўня Экадом далучыўся да Дня палітвязня ў Беларусі, абвешчанага праваабарончым цэнтрам «Вясна», і расказаў пра экалагічных актывіста_к у зняволенні. Таксама мы прынялі ўдзел у канферэнцыі ў Венскім універсітэце «Абаронцы навакольнага асяроддзя», дзе расказалі пра сітуацыю з экаактывіст_камі ў Беларусі.




Мы таксама прынялі ўдзел у падрыхтоўцы кааліцыяй праваабарончых арганізацый пры агульнай каардынацыі Беларускага Хельсінкскага Камітэта Прамежкавага даклада аб выкананні рэкамендацый, атрыманых Рэспублікай Беларусь у рамках трэцяга цыкла Універсальнага перыядычнага агляду. У справаздачы ў тым ліку адзначаецца негатыўная тэндэнцыя выхаду Беларусі з міжнародных пагадненняў.

«Беларусь прадэманстравала нежаданне прытрымлівацца міжнародных прынцыпаў аховы навакольнага асяроддзя і абароны экалагічных правоў грамадскасці, спыніўшы свой удзел у дзвюх міжнародных дамовах. Беларусь услед за выхадам з Орхускай канвенцыі выйшла з Бернскай канвенцыі. Рэспубліка Беларусь таксама не прасунулася ў фарміраванні заканадаўства ў галіне змянення клімату і змяншэння небяспекі бедстваў. Не выкананы пункты Плана мерапрыемстваў па рэалізацыі палажэнняў Парыжскага пагаднення да РКЗК (Рамачнай канвенцыі аб змяненні клімату) ААН і інш.»

Таксама Экадом далучыўся да заявы Каардынацыйнай рады з нагоды ўдзелу беларускага рэжыму ў Саміце і Канферэнцыі ААН па змяненні клімату COP28 у Арабскіх Эміратах, дзе ў тым ліку згадана сітуацыя з экалагічнымі НДА і выхадам з Орхускай канвенцыі.

Акрамя таго, мы лічым важным расказваць пра сітуацыю ў беларускай экасферы не толькі ўнутранай, але і знешняй аўдыторыі. Так, у межах зборніка беларускага нацыянальнага моладзевага савета «РАДА» «БЕЛАРУСЬ.МОЛАДЗЬ.ЖЫВЕ» мы паглядзелі, што ў экалагічным актывізме змянілася пасля 2020 года для моладзі, а таксама паразважалі для беларускіх і замежных медыя, што за апошнія гады адбылося з беларускім экаактывізмам і якія гэта мае наступствы для краіны.





# ВЫРАШЭННЕ ЭКАЛАГІЧНЫХ ПРАБЛЕМ У БЕЛАРУСІ

## *ПРА ШТО ГЭТА І НАВОШТА*

**Экадом дапамагае людзям рэалізоўваць права на ўдзел у прыняцці важных рашэнняў і самастойна спраўляцца з мясцовымі экалагічнымі праблемамі дзякуючы бясплатным кансультацыям з алгарытмамі дзеянняў і шаблонамі зваротаў у дзяржаўныя органы, а таксама іншай экспертнай падтрымцы.**

**204 звароты** за 2023 год (на 30% больш за 2022 год)

Самы актыўны месяц – **снежань**. Самы неактыўны месяц – **студзень**.

Самай папулярнай тэмай, як і ў мінулым годзе, была тэма зялёных насаджэнняў, а менавіта незаконная, няправільная абрэзка або высечка дрэў, – 51 запыт, ці кожны чацвёрты зварот. На пяткі ёй наступае тэма адходаў: пра гэта было 50 зваротаў, ці 24,5% ад агульнай колькасці кейсаў. На трэцім месцы – запыты інфармацыі (напрыклад, як скласці зварот у тую ці іншую арганізацыю), якіх агулам было 33 (ці 16%).

Па традыцыі, часцей за ўсё запыты прыходзілі з Мінска і Мінскай вобласці – 91 зварот, ці 45% усіх кейсаў. Менш за ўсё звярталіся з Гродна і Гродзенскай вобласці, з Віцебска і Віцебскай вобласці – па 6 кейсаў, ці 3% ад усіх запытаў з кожнай вобласці. Беларус_кі дыяспары часцей за ўсё звярталіся з Польшчы – 19 запытаў, ці 9% усіх кейсаў, а самы «далёкі» зварот прыйшоў з Канады.

## *Даныя па месцазнаходжанні:*




**91** Мінск, вобласць

**6** Гродна, вобласць

**9** Брэст, вобласць

**6** Віцебск, вобласть

**8** Магілёў, вобласть

**9** Гомель, вобласть

**37** невядома

**19** Польшча

**1** Канада

**2** Літва

**7** Латвія

**5** Грузія

**2** Расія

**2** Германія

## *Даныя па тэмах:*

**3** забруджванне паветра

**33** запыт інфармацыі

**10** вада / водныя рэсурсы

**51** зялёныя насаджэнні (вырубка, кампенсацыйныя пасадкі, абрэзка)

**50** адходы

**25** жывёлы

**6** будаўніцтва

**17** грамадскія абмеркаванні / справаздачы аб АУНА / грамадска-экалагічныя экспертызы

**1** добраўпарадкаванне тэрыторый

**2** забруджванне глебы

**1** шум

**1** пажары

**4** невядома

## *Маніторынг і ацэнка заканадаўства па ўдзеле грамадскасці*

Нашы юрыст_кі адсочваюць, што змяняецца ў заканадаўстве па пытаннях удзелу грамадскасці, і расказваюць пра гэтыя змяненні, каб грамадзян_кі маглі лепш ведаць і больш эфектыўна абараняць свае экаправы.

За 2023 год у заканадаўстве адбыўся шэраг змяненняў: напрыклад, з'явіўся **новы парадак** падачы электронных зваротаў. Мы лічым, што насуперак заяўленым намерам новы парадак ускладняе доступ грамадзян_ак да рэалізацыі права на ўдзел у прыняцці важных рашэнняў. Таксама на грамадскія абмеркаванні выносілася **канцэпцыя экалагічнага кодэкса Беларусі,** і мы пастараліся паглядзець, што новага і карыснага для нашай краіны прапанавалі яе стваральнікі. На жаль, нічога.

Акрамя змяненняў у заканадаўстве, мы адсочваем правапрымяняльную практыку і новыя ініцыятывы дзяржорганаў. Адной з такіх у 2023 годзе стала навіна пра планы «караць за ініцыятыву па акультурванні тэрыторый вакол дома». Мы лічым, што гэта **трансфер адказнасці**, а ад новай практыкі не выйграе ніхто.




Змяшалі разумныя словы, а руху наперад няма. Як у Беларусі рыхтуюць Экалагічны кодэкс

20.11.2023 | 16:08

2 кастрычніка ў Беларусі скончыліся грамадскія абмеркаванні праекту Канцэпцыі Экалагічнага кодэксу. Ідэя стварэння такога дакументу добрая, але рэалізацыя выклікае шмат пытанняў, кажуць экологі. Ёсць нават сумневы ў мэтазгоднасці ўсяго пачынання.

## *Асвета і інфармаванне пра магчымасці вырашаць экалагічныя пытанні*

У мінулым годзе мы праводзілі трэнінгі і мерапрыемствы пра магчымасці ўдзелу грамадскасці ў вырашэнні экалагічных праблем, расказвалі пра паспяховыя і няўдалыя кейсы, а таксама пра актуальны стан экалагічнага актывізму ў Беларусі. Цягам года мы ўдзельнічалі як эксперт_кі ў больш чым пяці мерапрыемствах пра тое, як палепшыць якасць жыцця ў сваім горадзе, якую дапамогу можна атрымаць ад нас і якія інструменты для вырашэння экапраблем цяпер існуюць, што можна зрабіць для вырашэння экапраблем Беларусі, знаходзячыся за мяжой, як экалагічна адзначаць святы і іншае.





# UWEC: ЭКАЛАГІЧНЫЯ НАСТУПСТВЫ ВАЙНЫ ВА УКРАІНЕ

## *ПРА ШТО ГЭТА І НАВОШТА*

**У 2022 годзе дзеля даследавання ўплыву ваенных дзеянняў на навакольнае асяроддзе паўстала міжнародная ініцыятыва UWEC, адным са стваральнікаў і ўдзельнікаў якой стаў Экадом. UWEC расшыфроўваецца як Ukraine War Environmental Consequences Work Group. Гэта працоўная група па наступствах вайны ва Украіне для навакольнага асяроддзя, у якой прадстаўлена і незалежная беларуская экспертыза. З'яўляючыся згуртаваннем эколагаў і экалагінь, журналіста_к, эксперта_к і актывіста_к, група мае за мэту распаўсюджванне праверанай інфармацыі і сумесны пошук рашэнняў экалагічных праблем, якія ўзнікаюць падчас вайны.**

Галоўнай экалагічнай катастрофай 2023 года стаў падрыў плаціны Кахоўскай ГЭС і спуск вадасховішча. Адразу пасля катастрофы UWEC сумесна з «Рэпарцёрамі без межаў» правяла вэбінар аб разбурэнні сістэмы вадасховішча, якое было крыніцай вады для сістэмы астуджэння Запарожскай АЭС. На вэбінары эксперт_кі UWEC Work Group казалі, што паўнавартасны аналіз наступстваў можна будзе правесці толькі праз некалькі месяцаў, і мелі рацыю. Сёння бачна, што прамыя негатыўныя наступствы падрыву плаціны не такія катастрафічныя, як гэта бачылася на момант здарэння. Аднак сам спуск вадасховішча паставіў новыя пытанні і задачы перад прыродаахоўні_цамі, эколагамі і экалагінямі.

У канцы чэрвеня сумесна з International Rivers, Украінскай прыродаахоўнай групай і іншымі арганізацыямі UWEC Work Group заявіла аб тым, што эколагі і экалагіні не падтрымліваюць аднаўленне ГЭС. Вяртанне ракі ў натуральнае рэчышча можа садзейнічаць адраджэнню экасістэм, у той час як рэканструкцыя ГЭС толькі павялічыць негатыўныя наступствы, выкліканыя катастрофай. Украінскі ўрад заявіў пра намер затапіць тэрыторыю вадасховішча і аднавіць ГЭС, але гэта стане магчымым толькі пасля спынення

вайны. Так што ў эколагаў, экалагінь і прыродаахоўні_ц яшчэ ёсць час спыніць непрадуманы план аднаўлення ГЭС, які, на думку эксперта_к, не мае ні эканамічнай, ні энергетычнай перавагі.

Падрыў плаціны Кахоўскай ГЭС таксама зноў узняў пытанне экацыду. Хоць у заканадаўстве Украіны, Беларусі і Расіі экацыд прапісаны як крымінальны артыкул, прававая сістэма ўсё яшчэ не адаптавана. На міжнародным узроўні экацыд застаецца хутчэй канцэпцыяй, чым дзейсным механізмам прыцягнення да адказнасці за злачынствы супраць прыроды. Гэта пакідае вялікую колькасць наўмысных разбуральных дзеянняў па ўсёй планеце беспакаранай.

Галоўнай праблемай 2023 года, якую вылучыла UWEC, стаў збор і верыфікацыя даных пра экалагічныя наступствы ваеннага ўварвання. Аналіз экалагічных наступстваў нават на тэрыторыях, дзе баявыя дзеянні вяліся ў першыя месяцы вайны, ускладнены. Большасць з іх па-ранейшаму закрыты для наведвання, праводзіць паўнавартасныя даследаванні глебы і біяразнастайнасці на іх нельга. Так што збор і аналіз звестак пра экалагічныя наступствы вайны можа заняць гады.

Працоўная група таксама аналізавала ўплыў вайны на прыродаахоўныя практыкі ва Украіне, у тым ліку цяжкасці ў працы эксперта_к і даследчы_ц, і тэму зялёнага аднаўлення Украіны. У наступным годзе гэта тэма, хутчэй за ўсё, стане адной з прыярытэтных для працы UWEC Work Group.

У рамках аднаго з 6 вэбінараў для журналіста_к па экалагічных наступствах вайны, арганізаваных працоўнай групай UWEC сумесна з Reporters Without Borders Sweden і Svea Green Foundation, **Марына Дубіна** расказала пра экаактывізм пасля 2022 года.

За год UWEC згадвалася ў больш чым 45 публікацыях, сярод якіх Mongabay, Nature.com, NY post, CNBC, Euronews, RFI і іншыя. Эксперты UWEC далі каля ста інтэрв'ю, а на сайце апублікавалі 49 аналітычных артыкулаў.




UWEC Work Group Вебинар#4 Преследования экологических активистов в России и Беларуси rus



# УСТОЙЛІВАЯ ЭНЕРГЕТЫКА І АНТЫЯДЗЕРНАЯ КАМПАНІЯ

### *ПРА ШТО ГЭТА І НАВОШТА*

**Асноўная мэта кампаніі – бяз’ядзернае развіццё і пераход да ўстойлівай энергетыкі Беларусі і суседніх з ёю краін. Мы назіраем за будаўніцтвам БелАЭС і вядзём яго незалежную экспертную ацэнку з 2009 года, а таксама інфармуем міжнародную супольнасць пра вядомыя парушэнні. Таксама мы штогод праводзім інфакампанію пра небяспеку атамнай энергетыкі і зброі ды рэфлексію досведу Беларусі да гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС.**

Напярэдадні штогадовага Чарнобыльскага тыдня, ініцыяванага Экадомам, мы пагаварылі пра тое, ці ёсць месца аднаўляльным крыніцам энергіі ў энергасістэме Беларусі, а таксама арганізавалі публічную лекцыю фізіка-ядзершчыка і эксперта праграмы «Бяспека радыёактыўных адходаў» Андрэя Ажароўскага. Андрэй расказаў поўнай залі, ці выгадная атамная энергетыка, куды падзець ядзерныя адходы, ці можа АЭС у Беларусі стаць вайсковым аб’ектам і пры чым тут ядзерная зброя. А пасля гутаркі Андрэй правёў майстар-клас па вымярэнні радыяцыі. Ты можаш паглядзець лекцыю ў запісе!

Мерапрыемствы Чарнобыльскага тыдня 2023 года былі прысвечаны асэнсаванню, інфармаванню людзей і абмеркаванню нямірнага атама, у тым ліку вепанізацыі АЭС, праблемам БелАЭС, пагрозе размяшчэння ядзернай зброі ў Беларусі і разважанням пра магчымую бяз’ядзерную будучыню Беларусі з выкарыстаннем устойлівай энергетыкі.

Разам з дыяспарай беларуса_к свету мы рыхтавалі «Чарнобыльскія шляхі» і адукацыйныя івэнты. Мітынгі і шэсці прайшлі як мінімум у 14 гарадах пад агульным лозунгам «НЕ ядзернай зброі ў Беларусі» на фоне новай пагрозы, якую нясе размяшчэнне расійскіх ядзерных узбраенняў. Сярод іх быў і Вільнюс, дзе сузаснавальніца Экадома **Ірына Сухій** зачытала Рэзалюцыю «Чарнобыльскага

шляху – 2023», а лідарка дэмакратычнага руху **Святлана Ціханоўская** выступіла з прамовай:

*– Нам і сёння замоўчваюць праўду пра Чарнобыль. Замоўчваюць праўду пра Астравецкую АЭС і пра вайну ва Украіне. Замоўчваюць магчымыя наступствы размяшчэння ядзернай зброі ў Беларусі. Чарнобыль нам даў вельмі важны ўрок. Чарнобыль навучыў нас не разлічваць на ўладу, а разлічваць на сябе. І дэмакратычны свет зможа дапамагчы нам толькі тады, калі пабачыць, што гэта патрэбна нам самім. Ад нас залежыць вельмі шмат! Мы павінны дэманстраваць, што мы супраць ядзернай зброі. Мы супраць паўтарэння новага Чарнобыля. Мы супраць расійскіх войскаў на сваёй зямлі! Мы супраць вайны!*



Акцыя «Чарнобыльскі шлях – 2023» у Вільнюсе, 26 красавіка 2023 года. Фота: Motolko.Help

Таксама акцыі **прайшлі** ў Варшаве, Гданьску, Кракаве, Вроцлаве, Шчэціне, Берліне, Капенгагене, Нью-Ёрку, Таронта, Тбілісі, Батумі і іншых гарадах.

У рамках Чарнобыльскага тыдня Экадом пасупрацоўнічаў з Еўрапейскім гуманітарным універсітэтам у арганізацыі майстар-класа па калажах і выставы прац студэнта_к, а таксама ў стварэнні і паказе перформанса з наступнай дыскусіяй з Ірынай Сухій. Мы вельмі рады, што пазней перформанс паказвалі паўторна.

Увесь красавік Экадом ладзіў інфакампанію ў TikTok, пра якую мы падрабязней расказваем у раздзеле «Папулярызацыя тэмы аховы навакольнага асяроддзя». Таксама мы прадставілі **новы сайт** для мабільных прылад «Перадоз» – народны маніторынг забруджаных у выніку аварыі на ЧАЭС тэрыторый. На сайце можна не толькі лёгка адсачыць наяўныя трэкі і даныя па маніторынгу радыяцыі, але і дадаць свае. Праца працягваецца і сёння, за год мы дадалі справаздачы па 17 тэрыторыях, і ты можаш далучыцца да маніторынгу! Падрабязнасці пра тое, **як «Перадоз» дапамагае беларус_кам** і як далучыцца, чытай **тут**.



У верасні, нягледзячы на нявырашаныя праблемы станцыі, пра якія шматразова казаў Экадом, улады спрабавалі легітымізаваць працэдуру запуску другога энергаблока БелАЭС праз ліпавыя «грамадскія слуханні». У **прамым эфіры** «Еўрарадыё» Ірына Сухій разам з Андрэем Ажароўскім абмеркавалі пытанні журналіста_к пра рэальную небяспеку станцыі, эканамічную выгаду ядзернай энергетыкі і тое, як другі блок БелАЭС атрымае ліцэнзію па бяспецы ў абход меркавання беларуса_к. Таксама Экадом ініцыяваў заяву ад Нарады фракцый Каардынацыйнай рады наконт так званых слуханняў. Безумоўна, мы даслалі свае заўвагі ад розных асоб і нават **атрымалі** на іх адпіскі. Што цікава, адказы прыйшлі ўсім, акрамя кіраўніцы антыядзернага напрамку Экадома Ірыны Сухій.



# ЗЯЛЁНАЯ БЕЛАРУСЬ: РАСПРАЦОЎКА «ЗЯЛЁНАГА» БАЧАННЯ БУДУЧЫНІ БЕЛАРУСІ

## *ПРА ШТО ГЭТА І НАВОШТА*

ЗЯЛЁНАЯ БЕЛАРУСЬ

**30 кастрычніка 2023 года паўстаў новы суб'ект грамадзянскай супольнасці. Альянс «Зялёная Беларусь» створаны з ініцыятывы актывіста_к экалагічнай грамадзянскай супольнасці ды каманды эксперта_к, якія маюць досвед працы над стратэгічнымі дакументамі і добра знаёмыя з агульнасусветнымі зялёнымі трэндамі. Экадом з'яўляецца ўдзельнікам і адным са стваральнікаў альянсу.**

*– Гэта будзе краіна, у якой усе рашэнні прымаюцца зыходзячы з экалагічнай мудрасці і якая пабудавана на прынцыпах вяршэнства права, сацыяльнай справядлівасці, дэмакратыі, празрыстасці і ўзаемадзеяння з грамадствам, сяброўства з навакольным асяроддзем, кліматычнай нейтральнасці і адаптацыі, міжнароднага супрацоўніцтва, устойлівасці і цыркулярнасці,* – заяўляюць сябры альянсу.

Мы ўпэўнены ў магчымасці пабудаваць зялёную Беларусь як частку агульнага свету, заснаванага на гэтых прынцыпах. Пераход на чыстую ўзнаўляльную энергетыку і ўстойлівую зялёную эканоміку, сінхранізацыя з Еўрапейскім зялёным курсам, прымяненне прынцыпаў справядлівага пераходу ў дачыненні да Беларусі – усё гэта эксперт_кі маюць на ўвазе, калі кажуць пра зялёную Беларусь сёння.

Эксперт_кі альянсу працуюць над дакументамі і дарожнымі картамі, якія спатрэбяцца Беларусі ў пункце палітычнай трансфармацыі. Усяго для працы выдзелілі 11 напрамкаў: тэрытарыяльнае развіццё, сельская гаспадарка, энергетыка, транспарт, прамысловасць, біяразнастайнасць, адукацыя і развіццё патэнцыялу, адходы і прадухіленне іх стварэння, лічбавізацыя, фінансы, зялёныя інвестыцыі і сацыяльная палітыка.

Сёлета эксперт_кі засяродзіліся на галінах энергетыкі, мабільнасці, біяразнастайнасці і адукацыі, аналізавалі існуючае заканадаўства і працавалі над дарожнымі картамі для дасягнення Беларуссю зялёнага пераходу, арганізоўвалі курсы па ўстойлівым развіцці і зялёнай эканоміцы.

У 2024 годзе «Зялёная Беларусь» будзе абмяркоўваць дарожныя карты ў іншых сектарах, аналітыку заканадаўства ў галіне энергетыкі і магчымасці пераходу да нізкавугляроднай эканомікі.



# ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ ТЭМЫ АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ

## *ПРА ШТО ГЭТА І НАВОШТА*

**Для нас важна зразумела і цікава расказваць, над якімі тэмамі мы працуем, а таксама заахвочваць агульную цікаваць да экалагічных выклікаў. Мы хочам, каб як мага больш беларуса_к усведамлялі сваю адказнасць за агульную будучыню і разумелі, што спрыяльнае навакольнае асяроддзе – гэта права чалавека, якое важна ўмець рэалізоўваць. Для гэтага мы актыўна вядзём нашы сацыяльныя сеткі, рыхтуем матэрыялы для сайта, сацсетак і СМІ, ладзім калабарацыі з суполкамі ды інфлюенсер_камі, а таксама праводзім мерапрыемствы і выкарыстоўваем новыя метады для папулярызацыі экалагічнай тэматыкі.**

### *У 2023 годзе мы:*

- правялі Чарнобыльскі тыдзень з калабамі з ЕГУ і клёвай інфакампаніяй у TikTok
- цалкам абнавілі дызайн сайта: цяпер ён больш зручны і прывабны (мы спадзяёмся)
- дадалі 98 матэрыялаў на сайт Экадома і падрыхтавалі шма-а-ат пастоў для нашых падпісчы_ц
- зладзілі ў тры разы больш партнёрстваў у сацсетках, чым у 2022 годзе
- прынялі ўдзел у стварэнні выставы «Птушкі па-за палітыкай?»

Увесь красавік у рамках **Чарнобыльскага тыдня** Экадом ладзіў інфакампанію ў TikTok. Тэма чарнобыльскай трагедыі практычна замоўчваецца ў моладзі альбо раскрываецца праз досыць фармальнае паведамленне пра гадавіну і жахі аварыі. Таму ў нас узнікла ідэя перазапусціць грамадскае абмеркаванне гэтай тэмы, разгарнуць камунікацыю для тых, хто не паглыблены ў яе, і для тых, хто ўжо добра валодае пытаннямі спадчыны Чарнобыля і ядзернай энергетыкі. У 24 роліках па хэштэгу #чарнобыльскітыдзень, якія агулам сабралі сотні каментарыяў і 395 тысяч праглядаў, эксперт_кі і блогер_кі адказвалі на набалелыя пытанні пра атамную энергетыку і БелАЭС, жартавалі з каментарыяў чыноўнікаў і расказвалі пра тое, як звязаны Чарнобыль і культура, а таксама «Чарнобыльскі шлях» і стварэнне праваабарончага цэнтра «Вясна».




У чэрвені Экадом удзельнічаў у **мерапрыемстве «Яднайся»**, дзе расказваў пра дзейнасць арганізацыі, запрашаў жадаючых напісаць лісты і паштоўкі для палітвязняў-экаактывіста_к і прапаноўваў беларус_кам прагаласаваць за тры найважнейшыя для іх экапраблемы. Свой голас аддала і лідарка дэмакратычнага руху Святлана Ціханоўская: яна адзначыла размяшчэнне ў Беларусі ядзернай зброі, Астравецкую АЭС і высечку дрэў.



А ўжніўні мы з задавальненнем далучыліся да **RADA Market**. Агулам за дзве гэтыя імпрэзы людзі падпісалі больш за 35 паштовак палітвязням-экаактывіст_кам, і некалькі сотняў беларуса_к глыбей пазнаёміліся з дзейнасцю Экадома.

Таксама ў Варшаве прайшла **выстава «Птушкі па-за палітыкай?»** ад Institut für Europäische Politik, KuB і Экадома. На ёй аўдыторыі прапанавалі адшукаць адказ на пытанне: ці могуць птушкі, якія не ведаюць слоў «дыктатура» ці «дэмакратыя», быць па-за палітыкай у краіне, дзе можна трапіць за краты за няправільны колер шкарпэтак? На пілотным паказе людзі

падпісалі 100 лістоў ды паштовак палітвязням і палітвязынкам.




За год **сайт Экадома** наведала больш за 15 тысяч карыстальні_ц, а медыя ўзгадалі нас 377 разоў. Мы вельмі ўдзячныя нашай аўдыторыі і СМІ за давер і цікаўнасць да экатэматыкі. Таксама мы зрабілі больш за 35 публікацый у нашых сацсетках у партнёрстве са СМІ, ініцыятывамі, арганізацыямі, суполкамі і блогер_камі – гэта ў тры разы больш за 2022 год! Сярод іх politzek.me, праваабарончы цэнтр «Вясна», «ІншыЯ», Sojka media, «Зялёны партал», Ecospace, «Годна», KYKY, The Village, RADA, Маргарыта Ляўчук, Ксенія Тырсікава і шмат іншых – дзякуем!




**Нягледзячы на статус «экстрэмісцкага фарміравання», за год нашы пасты пабачылі амаль 450 000 чалавек, а відэа ў акаўнце Экадома ў TikTok праглядзелі больш за 313 тысяч разоў! Мэта на 2024 год – адзін мільён. Як думаеш, атрымаецца?**

**Ты можаш дапамагчы нам у гэтым! Калі ты не ў Беларусі, падпішыся на нашы сацсеткі і рэпостні самы цікавы для цябе пост, каб расказаць пра Экадом сябрам. Гэта вельмі дапаможа нам дацягнуцца да новай аўдыторыі ў той час, як людзям унутры краіны небяспечна падпісвацца на нас або ставіць нашым пастам падабайкі, і разам мы пашырым зялёную павестку.**



# ПЛАНЫ НА БУДУЧЫНЮ

У 2024 годзе мы працягваем працу па напрамках дзейнасці Экадома, а таксама плануем пашырыць і разнастаіць сваё ўзаемадзеянне з суполкамі актыўных беларуса_к па свеце. Неўзабаве пачнецца праца над Чарнобыльскім тыднем 2024 года.

У Каардынацыйнай радзе, куды ўваходзіць і Экадом, у хуткім часе адбудуцца выбары, і мы далучаемся да закліку паўдзельнічаць у іх, калі для вас гэта бяспечна.

Таксама разам з альянсам «Зялёная Беларусь» мы будзем працягваць усё магчымае, каб зялёная Беларусь хутчэй стала рэальнасцю.

Выстава «Птушкі па-за палітыкай?» будзе паказана ў новых гарадах. Чакай афішы!

**А каб не прапусціць усе нашы апдэйты, падпішыся на сацсеткі Экадома і раскажы пра нашу дзейнасць сваім знаёмым. Разам для зялёнай Беларусі!**

**ecohome.ngo**
**ecohome.by@gmail.com**